**А.В.Калашнікава**, *ст. выкладчык*

# РОЛЯ КУРАТАРА Ў ПРАЦЭСЕ СТВАРЭННЯ КАЛЕКТЫЎНЫХ ФОРМАЎ АРГАНІЗАЦЫІ ВОЛЬНАГА ЧАСУ СТУДЭНТАЎ

Даследуючы арганізацыю адпачынку студэнтаў, трэба звярнуць ўвагу на ролю куратара акадэмічнай групы ў гэтым працэсе, яго функцыі, метады, падыходы да дзейнасці, кірункі і змест куратарскай работы ў сацыякультурнай сферы. Куратар павінен валодаць ведамі не толькі ў галіне педагогікі, але і псіхалогіі, культуралогіі, паліталогіі, масавых камунікацый і права.

Галоўным зместам куратарскай дзейнасці з'яўляецца адпаведнасць яе сацыяльнай палітыцы і кірункам выхаваўчай работы ВНУ ў цэлым. Для рэалізацыі гэтага зместу куратар узаемадзейнічае з аддзелам выхаваўчай работы універсітэта (перспектыўнае планаванне, фарміраванне і развіццё традыцый, арганізацыя культурна-масавых мерапрыемстваў), адміністрацыяй інтэрнатаў (арганізацыя мерапрыемстваў у інтэрнаце, сацыяльна-культурная дзейнасць у інтэрнаце), прафкамам студэнтаў і іншымі маладзёжнымі грамадскімі арганізацыямі, намеснікамі дэканаў па выхаваўчай рабоце і органамі студэнцкага самакіравання (прыцягненне студэнтаў да актыўнага адпачынку, раскрыццё іх творчага патэнцыялу і інш.).

Мэты і задачы арганізацыі адпачынку студэнтаў абумоўліваюць падбор адпаведных метадаў, формаў і сродкаў. Важнасць і адказнасць работы куратара выяўляюцца ў яго функцыях, асабліва такіх, як прагнастычная (куратар прымае ўдзел у распрацоўцы і стварэнні праграм сацыякультурнай работы, праектаванні і мадэрнізацыі адпачынкавай сферы ў інтэрнаце, групе), арганізатарская (куратар выступае арганізатарам сацыяльна-культурнай дзейнасці студэнтаў, развіваючы пры гэтым ініцыятыву, творчы патэнцыял і самадзейнасць як адной асобы, так і калектыву, ён каардынуе развіццё ініцыятыў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

моладзі), культурастваральная (праяўляецца ў захаванні, абнаўленні і развіцці культуры, прадвызначае арыентацыю на выхаванне ў чалавека культуры) і камунікатыўная (грунтуецца на аснове дыялога, куратар наладжвае кантакты з бацькамі, выкладчыкамі, а таксама з рознымі інстытутамі, якія здзяйсняюць выхаваўча-адукацыйны працэс).

Формы арганізацыі адпачынку, рэалізацыі канкрэтных адпачынкавых праграм могуць быць розныя: індывідуальныя, групавыя, калектыўныя і масавыя. Рэалізацыя практычных праграм ажыццяўляецца ў дзейнасці і фарміраванні вопыту грамадскіх, сацыяльных паводзін (рэпрадуктыўныя, праблемна-пошукавыя, індуктыўныя і дэдуктыўныя метады). Асноўныя формы гэтай работы – стварэнне сітуацый, педагагічныя і сацыяльныя патрабаванні, інструктаж, назіранне, ілюстрацыя і дэманстрацыя.

Значная роля належыць стымуляванню і матывацыі дзейнасці і паводзін. Асноўныя формы ў гэтым выпадку – спаборніцтва, саперніцтва, заахвочванне, пакаранне і інш. Абавязкова праводзіцца кантроль за эфектыўнасцю працэсу арганізацыі вольнага часу. Формы кантролю могуць быць розныя.

Падыходы ў практычнай дзейнасці куратара групы на рэалізацыі адпачынкавых праграм наступныя: выхаваўча-мэтавы, сацыяльна-мэтавы, калектыўна-мэтавы, творча-мэтавы, інфармацыйна-навучальны, развіццёва-навучальны, пазнавальна-навучальны, псіхолага-навучальны і інш. Найбольш характэрнымі для рэалізацыі адпачынкавых праграм з'яўляюцца калектыўна-мэтавы і творча-мэтавы падыходы.

Адна з задач куратарскай дзейнасці па арганізацыі вольнага часу студэнтаў заключаецца ў фарміраванні сацыяльных груп – калектываў з высокай ступенню развіцця, здольных самастойна вырашаць задачы球 рознага прызначэння. Гэтыя групы могуць браць на сябе адказнасць за выкананне сацыяльных функцый. Дзейнасць калектыву, якая не патрабуе вялікіх намаганняў па ўнутраным рэгуляванні, будзе ўстойлівай да

змянення яго мэт і задач. У гэтым выпадку значна ўзрастаюць ролі калектыўна-мэтавага і творча-мэтавага падыходаў.

Адным з кірункаў дзейнасці куратара ў працэсе арганізацыі вольнага часу моладзі з'яўляецца выхаванне грамадзянскасці, адказных адносін да сваіх правоў і абавязкаў. З гэтай мэтай у БДУ культуры і мастацтваў дзейнічаюць творчыя калектывы, розныя аб'яднанні, якія праводзяць разнастайныя культурна-масавыя мерапрыемствы: вечарыны, канцэрты, выставы патрыятычнай накіраванасці, сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, творчымі людзьмі, наведванне музеяў і інш. У нашай ВНУ працуюць клубы па інтарэсах, арганізавана валанцёрства, рэалізуецца праграма «Турызм і адпачынак» і інш.

У мэтах эфектыўнасці праводзімай сацыяльна-культурнай работы куратар імкнецца, каб студэнты ведалі індывідуальныя асаблівасці сваіх таварышаў у групе. У гэтым выпадку яму лягчэй падтрымліваць ініцыятыву студэнтаў у працэсе арганізацыі вольнага часу, працаваць са студэнцкім актывам, фарміраваць творчы актыў па арганізацыі адпачынку групы. Куратар павінен сістэматычна ўдасканальваць сваё педагагічнае майстэрства, шукаць інавацыйныя падыходы да арганізацыі вольнага часу студэнтаў.

У працэсе ацэнкі куратарскай дзейнасці па арганізацыі вольнага часу студэнтаў трэба ўлічваць, якая работа была праведзена куратарам па наступных кірунках:

1) арганізацыя культурна-масавых мерапрыемстваў (культурна-забаўляльных, культурна-асветніцкіх, па эстэтычным выхаванні, па прапагандзе здаровага ладу жыцця);

2) удзел студэнтаў у рабоце гурткоў, клубаў па інтарэсах, дыспутах (колькасць прыцягнутых студэнтаў, арганізацыя рэжыму, прынцыпаў работы);

3) асветніцкая работа (азнаямленне студэнтаў з традыцыямі універсітэта, інтэрната і інш.);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4) павышэнне самаадукацыі, самаўдасканаленне прафесійных якасцей куратара (перападрыхтоўка; прымяненне новых формаў і метадаў работы; праяўленне зацікаўленасці ў развіцці прафесійных якасцей).

1. *Калачёва И.И.* Профессиональная культура социальных педагогов. – 2-е изд. -- Мн.: Академкнига, 2000.

2. *Левко А.И., Ахметова Л.В.* Проблемы ценности в системе образования. – Мн.: МО РБ, 2000.

3. *Молодёжь* и поликультурное образование в высшей школе Беларуси: пособие для адм.-упр. кадров высш. шк. – Мн.: Тесей, 2003.

4. *Организация* воспитательной работы в студенческом городке: пособие / Бычковский П.М., Попок Р.П., Невар А.С., Богомазов А.П. – Мн.: БГУ, 2003.

5. *Сенько Т.В.* Успех и признание в группе. – Мн.: Нар. асвета, 1991.

6. *Шумская Л.И., Завадская Ж.Е.* Основы воспитательной работы с учащейся молодёжью: учеб. пособие. – Мн.: Універсітэцкае, 2000.

7. *Яскевич Я.С.* Мировоззренческие основы идеологии белорусского государства: материалы лекции для слушателей по курсу «Основы идеологии белорусского государства: методология и методика преподавания». – Мн.: РИВШ БГУ, 2003.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ